ламы, о готовящихся съемках новых передач, сведениями о кадровых перестановках в телекомпаниях и т.д. Владение этой информацией помогает ей в объяснении той или иной цифры в результатах еженедельного зрительского голосования и определения удачи / разочарования недели.

Итак, А. Бородина – не только обозреватель, но и корреспондент, освещающий все то, что недоступно обычным гражданам узнать из текущей практики деятельности главных российских телекомпаний. Этот автор дает возможность аудитории заглянуть за «кулисы» телекомпаний, получить информацию о готовящихся к эфиру шоу, фильмах, сериалах, играх, а также намечающихся или возможных кадровых перестановках в редакциях и т.п.

**Аксана Бязлепкіна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## СУЧАСНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ ДЫСКУСІІ Ў ПОСТКАЛАНІЯЛЬНЫМ АСПЕКЦЕ

Напрыканцы ХХ ст. у беларускім літаратурным працэсе паступова прышчапляліся новыя мастацкія кірункі і метады аналізу мастацкага твора: спачатку ішло тэарэтызаванне ў адпаведных тэрмінах, а потым рабіліся спробы практычнага ўвасаблення тэорыі [4, с. 80–81]. У такім кантэксце можна разглядаць і спробы ўвесці ў беларускую культурную прастору тэорыю посткаланіялізму. Пры гэтым сам тэрмін часта губляў змястоўнасць. Між тым, актуалізацыя посткаланіяльнага дыскурсу ў дачыненні да беларускай сітуацыі не выглядае бясспрэчнай.

Даследчыкі (Б. Гройс, А. Зінам), асэнсоўваючы гісторыю Расійскай імперыі ХІХ ст., сцвярджаюць, што яна займалася ўнутранай каланізацыяй, якая разумеецца то як каланізацыя простых людзей уладамі (то бок гаворка пра стварэнне нацыі і правядзенне дзяржаўных рэформ), то як каланізацыя заваяваных раней тэрыторый [8, с. 45]. На гэты тэзіс дасціпна адказаў расійскі даследчык А. Эткінд: маўляў, пры такім падыходзе трэба вывучаць французскую каланізацыю Брэтані ці Эльзаса, а не Канады ці Афрыкі, але ён жа і пацвярджае, што місіянерства, этнаграфія і экзатычныя падарожжы, характэрныя феномены каланіялізму, у Расіі былі скіраваны ўнутр уласнага народа [7]. Народніцтва стала вынікам гэтага працэсу і знайшло сваё выяўленне і на беларускім матэрыяле (гл. творы Ф. Багушэвіча).

Замежныя навукоўцы адзначаюць амбівалентнасць сітуацыі, якая склалася ў СССР у кантэксце посткаланіяльных даследаванняў. З аднаго боку, некаторыя даследчыкі (напр., амерыканскі гісторык Дж. Адэльман [1]) сцвярджаюць, што СССР – акупант Беларусі. Такая пазіцыя дазваляе спытаць: якую радзіму баранілі беларусы ў часы вайны і чаму былі патрыётамі СССР, а таксама прапанаваць адмовіцца ад патрыятычнага тэрміна Вялікая Айчынная вайна на карысць ідэалагічна-нейтральнага тэрміна Другая сусветная вайна (англійскі гісторык Дж. Барбер [3]).

З іншага боку, у грунтоўным выданні Б. Эшкрафта «The Empire writes back. Theory and Practice in Post-colonial Literature» СССР не разглядалася як імперыя з калоніямі. Г. Імпосці, залічыўшы Расію да каланізатараў, адзначыла яе прынцыповае адрозненне ад класічных еўрапейскіх імперый – адсутнасць прасторавага разрыву паміж метраполіяй і калоніямі [8]. То бок робіцца спроба апісаць адносіны паміж суседнімі краінамі ў тэрмінах посткаланіяльнай тэорыі. Магчыма, гэта было б справядліва пры наяўнасці цывілізацыйнага разрыву (так званай «культурнай дыстанцыі») і адпаведным стаўленні да мясцовага насельніцтва. Тутэйшыя (а ў ХІХ ст. усведамленне сябе тутэйшым – крок да ўсведамлення сябе беларусам, але гаворка ў першую чаргу пра сялян і дробную шляхту) бачыліся замежнікамі як суб'екты варожыя і незразумелыя: напрыклад, менавіта такі вобраз беларусаў ствараецца ў мастацкіх тэкстах (гл. раман Б. Сачанкі «Агліцкая сталь») ці мастацкіх фільмах (карціну А. Кудзіненкі «Масакра»). Пры гэтым варта адзначыць, што стаўленне расіян да беларусаў у ХІХ ст. нельга параўнаць са стаўленнем белых да чорных у ЗША нават у сярэдзіне ХХ ст. (напрыклад, трэцяя хваля Ку-Клукс-Клана, гета для «чорных»,

асобныя вагоны для людзей розных колераў скуры), стаўленнем англічан да індыйцаў (гэта стаўленне людзей, якія адчуваюць сваю інтэлектуальную і таму цывілізацыйную перавагу). Але расіяне прызнавалі цывілізацыйную перавагу заходніх навадалучаных тэрыторый Расійскай імперыі і нават рабілі спробы супрацьстаяць такім меркаванням унутры краіны [5].

Нягледзячы на тое, што Беларусь не была калоніяй Расіі за савецкім часам і статус яе як калоніі спрэчны ў дачыненні да гісторыі XIX ст., у сучасным беларускім літаратурным працэсе прысутнічае посткаланіяльны дыскурс. Робяцца спробы (І. Бабкоў [2]) прыкласці тэарэтыка-метадалагічныя напрацоўкі заходніх даследчыкаў посткаланіялізму, нягледзячы на супраціўленне матэрыялу. Для прышчаплення посткаланіяльнай тэрміналогіі і паняццяў у беларускім літаратурным працэсе выкарыстоўваецца жанр эсэ, у якім ад аўтара не патрабуецца логіка і аб'ектыўнасць навуковага даследавання, а таму адсутнічаюць неабходныя фрагменты з аналізам гісторыі Беларусі ў посткаланіяльным аспекце. Паколькі посткаланіяльная тэорыя ў дачыненні да беларускай сітуацыі застаецца неабгрунтаванай, то прыўлашчванне беларускімі аўтарамі даробку заходніх даследчыкаў адбываецца па-за тэрміналогіяй (літаратуразнаўчыя даследаванні М. Мартысевіч [6]), а таму ў літаратурных дыскусіях пра мэйнстрым і маргінальнасць у беларускай літаратуры, пра стаўленне да традыцыі, выкліканых па сутнасці розным бачаннем гісторыі і статусу беларускай літаратуры, посткаланіяльны дыскурс прысутнічае толькі імпліцытна.

*Літаратура*

1. Адельман, Дж.Р. Вторая мировая война и источники «холодной войны» / Дж.Р. Адельман // Россия в XX веке: историки мира спорят: сборник / Рос. АН, Ин-т рос. истории, Отд-ние истории; [Редкол.: И.Д. Ковальченко (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1994. – С. 562–577.
2. Бабкоў, І. За небакраем Эўропы / І. Бабкоў // Каралеўства Беларусь. Вытлумачэнне ру[і]наў / І. Бабкоў. – Мінск: Логвінаў, 2005. – С. 7–10.





3. Барбер, Дж. Роль патриотизма в Великой Отечественной войне / Дж. Барбер // Россия в XX веке: Историки мира спорят: сборник / Рос. АН, Ин-т рос. истории, Отд-ние истории; [Редкол.: И.Д. Ковальченко (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1994. – С. 447–452.
4. Бязлепкіна, А.П. Ідэйна-мастацкая пераемнасць у беларускім літаратурным працэсе канца XX ст.: дыс. ... канд. філал. навук: 10.01.01 / А.П. Бязлепкіна; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск, 2006. – 127 с.
5. Горизонтов, Л. «Польская цивилизованность» и «русское варварство»: основания для стереотипов и автостереотипов / Л. Горизонтов // Миф Европы в литературе и культуре Польши и России: сборник / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения, Пол. акад. наук, Ин-т лит. исслед.; [Редкол.: М.В. Лескинен, В.А. Хорев]. – М.: Индрик, 2004. – С. 62–75.
6. Мартысевіч, М. Маргінальныя жанры вершу ў сучаснай беларускай паэзіі: эксперыментальны санэт / М. Мартысевіч // Беларускі калегіюм [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://baj.by/belkalehium/lekcyji/litaratura/martysievicz_02.htm. – Дата доступу: 13.03.2011.
7. Эткинд, А. Фуко и тезис внутренней колонизации: постколониальный взгляд на советское прошлое / А. Эткинд // НЛО. – 2001. – № 49 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/nlo/2001/49/etkind.html. – Дата доступа: 01.09.2011.
8. Imposti, G. Post-colonial theory. The case of the former Soviet Union / G. Imposti // Postmodernism and Postcolonialism: proceedings of the Conference held in Bologna, October 5th, 2001 / edited by Silvia Albertazzi, Donatella Possamai. – Padova, 2002. – P. 43–48.

**Арцём Кавалеўскі**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ВАРЫЯТЫЎНАСЦЬ ІНТЭРПРЭТАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ У АСЭНСАВАННІ ПАЭТЫЧНАГА ТЭКСТУ

Пытанні, адказы на якія дае мастацкі твор, – гэта не заўсёды тыя, што ўзнікаюць перад чытачом у момант прачытання, перачытвання і адаптацыі тэксту. Паэтычнае мысленне, маналагічнае па сваёй прыродзе, валодае тонкай і складанай алегарычнай арганізацыяй, тэхніка асацыіравання адыгрывае